вытрымкі з справаздач аб стане запасаў у Заслаўі на красавік 1812 года. У якасці дадатковых элементаў могуць быць выкарыстаны карты ваенных шляхоў, якія праходзілі праз рэгіён, і дыяграмы, што ілюструюць аб'ёмы паставак і спажывання харчовых рэсурсаў. Такі музейны аб'ект будзе спрыяць фарміраванню цэласнага ўяўлення аб ролі Заслаўя ў ваеннай гісторыі Беларусі, падкрэсліваючы не толькі яго адміністрацыйнае значэнне, але і ўдзел у забеспячэнні арміі ў перыяд аднаго з найважнейшых канфліктаў XIX стагоддзя. Экспазіцыя можа стаць асновай для адукацыйных праграм, навуковых даследаванняў і культурна-асветнай дзейнасці [2].

Такім чынам, аналіз ваенна-гістарычнага кантэксту Заслаўя ў перыяд вайны 1812 года дазваляе сцвярджаць, што горад выконваў важную функцыю ў сістэме тылавога забеспячэння расійскай арміі, спалучаючы адміністрацыйны, лагістычны і вытворчы патэнцыял. Наяўнасць значных харчовых рэсурсаў, арганізацыя спецыялізаваных пякарных аб'ектаў і ўдзел у рэкруцкай кампаніі сведчаць пра яго інтэграванасць у агульнаімперскія ваенна-стратэгічныя механізмы. Улічваючы адсутнасць баявых дзеянняў на тэрыторыі Заслаўя, горад захаваў сваю інфраструктуру і здольнасць выконваць пастаўленыя функцыі, што падкрэслівае яго значнасць у тылавым забеспячэнні.

У гэтым кантэксце стварэнне асобнай музейнай экспазіцыі, прысвечанай ролі Заслаўя ў вайне 1812 года, у межах Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" з'яўляецца навукова абгрунтаваным і культурна актуальным крокам. Такая экспазіцыя здольная не толькі ўзбагаціць рэгіянальны гістарычны наратыў, але і стаць платформай для міждысцыплінарнага дыялогу, адукацыйных ініцыятыў і далейшага даследавання мясцовага ўкладу ў агульнаеўрапейскія ваенна-палітычныя працэсы XIX стагоддзя.

1. Вещиков, П. И. Военное хозяйство русской армии в Отечественной войне 1812 года / П. И. Вещиков // Пространство и Время. – 2012. – № 3. – С. 20–31.
2. Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" : [сайт]. – URL: https://zaslaue.by/ (дата звароту: 01.09.2025).
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 588. Воп. 1. Спр. 213. Арк. 9.
4. Отечественная война и русское общество : в 3 т. – Т. 3 / ред. совет: А. К. Дживелегов, С. П. Мельгунов, В. И. Пичета. – М. : Изд. Т-ва И. Д. Сытина, 1911. – 275 с.
5. Скалон, Д. А. Столетие военного министерства. 1802–1902 – Главное Интендантское управление. Исторический очерк / Д. А. Скалон. – СПб. : Тип. «Бережливость», 1903. – 542 с.

**Крумплеўская Г.А.**

## ЭТНАГРАФІЧНЫЯ ЭКСПЕДЫЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX СТАГОДДЗЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ АРХІВА ІНСТЫТУТА МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРА ІМЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ НАН БЕЛАРУСІ)[5]

*Ключавыя словы:* этнаграфічныя экспедыцыі, Віцебская вобласць, матэрыяльная і духоўная культура, матэрыялы архіва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы.

Найважнейшым цэнтрам даследавання і захавання этнаграфічнай спадчыны беларусаў на працягу многіх дзесяцігоддзяў з'яўляецца Акадэмія навук БССР/НАН Беларусі. Збіральніцкая і даследчыцкая дзейнасць у галіне этнаграфіі і фальклора праводзілася навуковымі супрацоўнікамі спачатку ў сектары этнаграфіі і фальклора Інстытута гісторыі, а з 1957 г. – у Інстытуце мастацтвазнаўства,

[5] Дадзены артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД Г25М-035 «Полевые этнографические исследования на территории Витебской области во 2-й пол. XX в. (по материалам архива Института искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы НАН Беларуси): комплексное изучение» (дзяржрэгістрацыя №20250912 ад 18.06.2025 г.)

этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы (ІМЭФ). Стварэнне ІМЭФ садзейнічала не толькі актывізацыі палявых этнаграфічных і фальклорных даследаванняў, але таксама і падрыхтоўцы прафесійных кадраў па розных галінах этнаграфічнай навукі [1, с. 361].

Мэта артыкула – прасачыць дынаміку палявых этнаграфічных даследаванняў на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў другой палове ХХ ст. па матэрыялах архіва ІМЭФ імя Кандрата Крапівы. Пры падрыхтоўцы артыкула за аснову ўзяты рукапісныя кнігі вопісаў архіўных матэрыялаў (Ф. 6, Воп. 1–7, 11–14; Ф. 7, Воп. 1, 2, 12), з якіх былі вылучаны матэрыялы, што датычацца тэрыторыі Віцебскай вобласці акрэсленага перыяду.

Адным з прыярытэтных накірункаў даследчыцкай дзейнасці ў айчыннай пасляваеннай этнаграфіі з'яўлялася вывучэнне традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларусаў. У архіве ІМЭФ імя Кандрата Крапівы захоўваюцца ўнікальныя этнаграфічныя матэрыялы: палявыя запісы, фотаздымкі, малюнкі і справаздачы, што адлюстроўваюць змены ў метадалогіі і тэматыцы экспедыцый другой паловы ХХ ст. Даследаванне этнаграфічных матэрыялаў архіва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора імя Кандрата Крапівы (Ф. 6; 7), сабраных пад час палявых этнаграфічных экспедыцый на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў другой палове ХХ ст., абумоўлена неабходнасцю захавання самабытных элементаў народнай культуры, абрадавых практык, многія з якіх у сучасных умовах знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Збор, сістэматызацыя, класіфікацыя архіўных матэрыялаў па рэгіёнах, тэматыцы, аўтарам і храналогіі дазваляюць выявіць рэгіянальныя асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры, гаспадарчага побыту і мастацкіх традыцый беларусаў асобна ўзятых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, што садзейнічае фарміраванню ўсяго этнакультурнага ландшафту Беларусі. Распрацаваныя тэматычная класіфікацыя і вылучэнне храналогіі ствараюць метадалагічную аснову для будучага міждысцыплінарнага вывучэння. Акрамя таго, вынікі работы маюць практычную каштоўнасць для далейшых навуковых даследаванняў (увядзенне ў навуковы зварот новых, раней невядомых этнаграфічных дадзеных), распрацоўкі адукацыйных праграм, розных ініцыятыў па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны, гістарычных рэканструкцый і г.д.

Архіў ІМЭФ імя Кандрата Крапівы мае свае адметныя асаблівасці, якія заключаюцца ў наступным: характар фарміравання фондаў – усе фонды, як правіла, з'яўляюцца адлюстраваннем вынікаў палявых этнаграфічных экспедыцый; разнастайнасць формаў дакументаў, сабраных пад час экспедыцый (дзённікі з запісамі інтэрв'ю і апісаннямі назіраных з'яў і аб'ектаў, фотаздымкі, бланкі стандартызаваных справаздач, а таксама разнастастайныя палявыя справаздачы, малюнкі, карты, схемы і інш.); розная маштабнасць экспедыцый (этнаграфічныя матэрыялы як адзінкавага індывідуальнага выезду, так і вынікі дзейнасці шматгадовых комплексных экспедыцый, якія праводзіліся ў супрацоўніцтве з прадстаўнікамі сумежных навук).

Комплекс этнаграфічных архіўных матэрыялаў, што былі сабраны на тэрыторыі Віцебскай вобласці, ахоплівае палявыя даследаванні, праведзеныя ў 1954–2003 гг. на тэрыторыі дадзенага рэгіёна. Па аб'ёме і тэматыцы ён адлюстроўвае шматгадовую працу Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы і ўключае больш за 600 адзінак захавання (Табл. 1). Пры складанні табліцы былі вылучаны перыяды, у якія праходзілі палявыя экспедыцыі непасрэдна на тэрыторыі Віцебскай вобласці.

**Табліца 1. Дынаміка этнаграфічных даследаванняў на тэрыторыі Віцебскай вобласці з 1954 па 2003 гг. (па матэрыялах фондаў 6, 7 архіва ІМЭФ імя Кандрата Крапівы)**

| Перыяд | Колькасць адзінак захавання | Асноўныя тэмы | Ключавыя аўтары |
|---|---|---|---|
| 1954–1956 | 95 | Жыллё, планіроўка вёсак, побыт, народная медыцына, адзенне | Малчанава Л.А., Грынблат М.Я. |
| 1959–1960 | 32 | Запісы ўспамінаў, адзенне, жыллё, сельскагаспадарчыя прылады | Залескі А.І., Іваноў В.М., Міцкевіч А.М., Камсюк Н.І. |
| 1966–1969 | 239 | Жыллё, сельскагаспадарчыя прылады, адзенне | Гуркоў В.С., Дулеба А.І., Малчанава Л.А., Бялявіна В.М., Мінько Л.І. |
| 1970–1974 | 169 | Сямейная абраднасць, этнічныя працэсы | Лобач М.С., Курыловіч А.Н., Каспяровіч Г.І., Іваноў В.М., Сабаленка Э.Р. |
| 1976–1980 | 53 | Ганчарства, ткацтва, матэрыялы для музея народнай архітэктуры і побыта | Мілючэнкаў С.А., Курыловіч А.Н., Каспяровіч Г.І., Сабаленка Э.Р., Ракава Л.В., Бялявіна В.М. |
| 1984–1990 | 11 | Сямейная абраднасць і побыт, вясковая культура | Ліпень Я.П., Кухаронак Т.І., Курыловіч А.Н. |
| 1993–2003 | 25 | Народная кулінарыя, педагогіка, каляндарная абраднасць, святочныя традыцыі | Навагродскі Т.А., Ракава Л.В., Бялявіна В.Н., Каспяровіч Г.І., Кухаронак Т.І., Курыловіч А.Н. |

Першая пасляваенная экспедыцыя (Гродзенска-Полацкая), якая закранула тэрыторыю сучаснай Віцебскай вобласці, праходзіла ў 1954 г. на беларуска-літоўскай мяжы (Браслаўскі, Пастаўскі, Відзаўскі раёны). У 1955 г. у складзе Віцебска-Магілёўскай экспедыцыі праводзіліся даследаванні ў Гарадоцкім, Лёзненскім, Дубровенскім раёнах Віцебскай вобласці, 1956 г. – у Расонскім і Докшыцкім раёнах. У 1959–1960 гг. матэрыяльная культура Віцебшчыны стала аб’ектам вывучэння ў рамках Клічаўска-Суражскай, Паўночна-беларускай і Паўночна-заходняй экспедыцый у Багушэўскім (скасаваны ў 1960 г.), Суражскім (скасаваны ў 1960 г.), Бешанковіцкім, Чашніцкім, Глыбоцкім, Пастаўскім раёнах Віцебскай вобласці.

Паводле матэрыялаў архіва, маштабнае этнаграфічнае даследаванне тэрыторыі Віцебскай вобласці навуковымі супрацоўнікамі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора імя Кандрата Крапівы пачалося з 1966 г. Этнаграфічная экспедыцыя ахапіла значную тэрыторыю сучаснай Віцебшчыны – Гарадоцкі, Лёзненскі, Віцебскі, Аршанскі, Докшыцкі, Дубровенскі, Бешанковіцкі, Полацкі, Глыбоцкі, Чашніцкі, Пастаўскі, Браслаўскі, Талачынскі, Сенненскі раёны. За перыяд з 1966 да 1969 гг. былі сабраны ўнікальныя этнаграфічныя матэрыялы па народнай культуры беларусаў Віцебшчыны – матэрыялы па жыллю, сельскагаспадарчых прыладах і тэхніцы, народным адзенні. Удзельнікамі этнаграфічных экспедыцый з’яўляліся Гуркоў В.С., Дулеба А.І., Малчанава Л.А., Бялявіна В.М., Мінько Л.І. і інш.

У 1970-я гг. працягнулася этнаграфічнае вывучэнне Віцебшчыны. Менавіта ў гэты перыяд былі распачаты этнасацыялагічныя даследаванні па вывучэнні культуры і побыту насельніцтва Беларусі ў цэлым і Віцебскай вобласці ў прыватнасці. Супастаўленне атрыманых вынікаў дало магчымасць усебакова падысці да разгляду асноўных тэндэнцый і заканамернасцей этнакультурнага развіцця беларусаў. Матэрыялы збіраліся шляхам анкетнага абследавання з далейшай апрацоўкай на ЭВМ [2, с. 548]. На Віцебшчыне з 1970 па 1974 г. быў сабраны каштоўны палявы матэрыял па сямейнай абраднасці беларусаў і этнічным працэсам. Сярод даследчыкаў, што займаліся этнаграфічным вывучэннем дадзенага рэгіёна можна вылучыць наступных: Лобач М.С., Курыловіч А.Н., Каспяровіч Г.І., Іваноў В.М., Сабаленка Э.Р. і інш. У гэты перыяд былі апублікаваны значныя работы па этнагенезе беларусаў, матэрыяльнай і духоўнай культуры сельскага і гарадскога насельніцтва рэспублікі, а таксама гісторыі этнаграфічнага вывучэння на Беларусі і інш.

У 1980-я гг. былі ажыццёўлены этнаграфічныя экспедыцыі на тэрыторыю заходняй часткі Віцебшчыны – Браслаўскі (1980), Пастаўскі (1984, 1985), Глыбоцкі (1987) раёны. У гэты час актыўна збіраліся этнаграфічныя матэрыялы па народных рамёствах: ганчарству (Мілючэнкаў С.А.), ткацтву (Курыловіч А.Н.). Сярод актуальных тэм, якія працягвалі распрацоўваць этнографы, вылучаецца вывучэнне сямейнай абраднасці беларусаў (Кухаронак Т.І., Ліпень Я.П., Курыловіч А.Н.).

У канцы ХХ – пачатку ХХІ ст., абапіраючыся на матэрыялы архіва ІМЭФ, можна меркаваць, што пад час правядзення палявых экспедыцый, асноўная ўвага канцэнтравалася на зборы этнаграфічных матэрыялаў, якія ў далейшым ляглі ў аснову навуковых распрацовак, прысвечаных тэме народнай народнай кулінарыі, каляндарнай абраднасці, вывучэнню святочных традыцый. Фіксацыю і збор этнаграфічных матэрыялаў ажыццяўлялі Навагродскі Т.А., Ракава Л.В., Бялявіна В.Н., Каспяровіч Г.І., Кухаронак Т.І., Курыловіч А.Н. і інш.

Такім чынам, палявыя даследаванні, што праводзіліся з 1954 па 2003 г., адлюстроўваюць змяненні прыярытэтных накірункаў у этнаграфічным вывучэнні тэрыторыі Беларусі ў цэлым і Віцебшчыны ў прыватнасці. Матэрыялы архіва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора імя Кандрата Крапівы дэманструюць пастаяннае пашырэнне геаграфіі палявых даследаванняў на тэрыторыі Віцебшчыны: ад лакальных экспедыцый 1954 г. да масавых комплексных выездаў, пачынаючы з 1966 г. Па матэрыялах, якія захоўваюцца ў архіве, можна прасачыць, як на працягу разглядаемага перыяду ў этнаграфічным даследаванні адбыўся тэматычны пераход: ад вывучэння элементаў матэрыяльнай культуры да сацыяльных структур, народнай педагогікі і рытуальных практык.

Прыкладная каштоўнасць сабраных матэрыялаў заключаецца ў магчымасці захавання і рэканструкцыі асобных элементаў традыцыйнага побыту беларусаў, выяўленні этнакультурных асаблівасцей, правядзенні комплекснага аналізу рэгіянальных адрозненняў і міждысцыплінарных супастаўленняў. Сістэматызаваныя архіўныя матэрыялы ствараюць трывалую аснову для далейшых даследаванняў па этнаграфіі, фальклоры, гісторыі, этналінгвістыцы і інш. Архіў ІМЭФ імя Кандрата Крапівы дэманструе сістэмнае развіццё этнаграфічных даследаванняў на тэрыторыі Віцебскай вобласці, якое праходзіла на працягу паўстагоддзя (выяўлена перыядызацыя праведзеных экспедыцый, пазначаны тэрытарыяльны ахоп, выкананы тэматычны аналіз архіўных матэрыялаў). Для максімальнага выкарыстання патэнцыялу матэрыялаў архіва ІМЭФ імя Кандрата Крапівы неабходна іх алічбоўка, стварэнне электроннай базы дадзеных, што адкрые новыя магчымасці іх захоўвання і далейшага выкарыстання навукоўцамі.

1. Беларусы: У 8 т. Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння / В. К. Бандарчык ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, А. І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – 365 с.
2. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.